**Алесь Каралькевіч: 35-я Сустрэча беларусаў Паўночнай Амерыкі**




Згуртаваньне Беларусаў Канады (ЗБК) і Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне (БАЗА) правялі 35-ы Саміт беларусаў Паўночнай Амэрыкі на выходныя ў Дзень працы 2024 у Таронта. Гэты саміт — адно з найбуйнейшых мерапрыемстваў беларускага замежжа, арганізаваных дыяспарай для дыяспары. Традыцыя такіх сустрэч вядзецца з 1952 года.

## Гісторыя

Першая сустрэча беларусаў Паўночнай Амэрыкі адбылася на канадзкім баку Ніягарскага вадаспаду ў ліпені 1952 году. Яна была прысьвечаная Янку Купалу. Паводле архіўных зьвестак ЗБК, на сустрэчу было каля 120 чалавек.



***Першы саміт беларусаў Паўночнай Амэрыкі на Ніягарскім вадаспадзе.***
*Ліпень 1952. (крыніца: “Жыццё Вінцэнта Жук-Грышкевіча”)*

№34, лістапад 2024 ISSN 2562-950

**35-я сустрэча праходзіла ў Таронта з 31 жніўня да 2 верасьня 2024 года**

***Дзень першы. 31 жніўня***





Першы дзень саміту прайшоў на базе паспяховага высокатэхналагічнага бізнесу GVA Lightning, створанага беларускім інжынерам і прадпрымальнікам Уладзімірам Грыгорыкам.

Кампанія GVA Lighting распрацоўвае і вырабляе унікальныя сістэмы асвятлення архітэктурных аб'ектаў, спалучаючы перадавыя тэхналогіі, навуку і мастацтва, каб падкрэсліць прыгажосць жамчужын сусветнай архітэктуры: Луўра, Лінкальн-цэнтра, Таўэрскага моста і дзесяткаў іншых аб'ектаў у розных краінах свету.

Па добрай канадскай традыцыі ўдзельнікі выказалі ўдзячнасць зямлі, на якой адбылася сустрэча. Новае пакаленне беларусаў прачытала словы на трох мовах.



French: *“Toronto se trouve sur le territoire du 'Bol avec une seule cuillère'. Le 'Bol avec une seule cuillère' est un traité entre les Anishinaabes, les Mississaugas et les*

*Haudenosaunees qui les engage à partager le territoire et à protéger la terre. Les Nations autochtones et les peuples qui ont suivi, ainsi que les Européens et tous les nouveau-venus, ont été invités à rejoindre ce traité dans un esprit de paix, d'amitié et de respect.”*

English: *“Great Toronto is in the 'Dish With One Spoon Territory'. The Dish With One Spoon is a treaty between the Anishinaabe, Mississaugas and Haudenosaunee that bound them to share the territory and protect the land. Subsequent Indigenous Nations and peoples, Europeans and all newcomers have been invited into this treaty in the spirit of peace, friendship and respect.”*

Belarusian: *“Вялікі Таронта знаходзіцца на «Тэрыторыі талеркі з адной лыжкай». Талерка з адной лыжкай - гэта дагавор паміж Анішынаабэ, Місісаугас і Хаўдэнасауні, які абавязаў іх сумесна жыць на гэтай зямлі і абараняць яе. Наступныя карэнныя нацыі і народы, а таксама еўрапейцы і ўсе знoўку прыбыўшыя былі запрошаны да гэтай дамовы ў духу міра, сяброўства і павагі.”*

Прагучалі гімны Канады, Злучаных Штатаў Амэрыкі і Беларускай Народнай Рэспублікі. З прывітальным словам выступіла Старшыня Рады БНР Івонка Сурвілла *(тэкст прыкладаецца)*.



***Старшыня Рады БНР Івонка Сурвілла вітае гасьцей 35-й Сустрэчы***



***Гасьцей вітаў Вячаслаў Бортнік, сябра БАЗА***

Аляксандра Логвін, старшыня ЗБК, афіцыйна адкрыла Сустрэчу і зачытала прывітальныя словы ад спадара Зянона Пазьняка (тэкст прыкладаецца).



Таксама быў прэзентаваны беларускі сцяг, які спадарыня Яноўская падняла над Эверэстам. Яе сваякі вынеслі яго на сцэну.



Затым адбылося прадстаўленне беларускіх суб’ектаў, дыяспарных суполак і праектаў:

- Рада Беларускай Народнай Рэспублікі
- Аддзелы Згуртаваньня Беларусаў Канады – Таронта, Атава, Манрэаль, Альбэрта
- Беларуская Аўтакефальная Праваслаўная Царква, прыход сьвятога Кірылы Тураўскага
- Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне БАЗА Вашынгтон, Флорыда, Нью-Ёрк

- Асацыяцыя беларусаў у Амэрыцы, ABA
- Асацыяцыя Беларускага Бізнесу Замежжа, ABBA
- Беларускі інстытут навукі і мастацтва імя Скарыны, Канада
- Беларускі інстытут навукі і мастацтва імя Скарыны, ЗША - Юрась Кіпель
- Фундацыя Крачэўскага - Валянціна Трыгубовіч
- Выдавецтва «Скарына Прэс». - Ігар Іваноў
- Выдавецтва «Грунвальд». - Вольга Яноўская
- Беларусы Чыкага - Жана Чарняўская
- Беларусы Осціна - Сяргей Адзінец
- Фонд BySol - Андрэй Стрыжак
- INeedHelpBY ініцыятыва - Піліп Гаўрышаў
- Дарадца Офіс Святланы Ціханоўскай - Франак Вячорка
- Дарадца Svetlana Tikhanovskaya's adviser па эканамічных рэформах - Алесь Аляхновіч
- Член Каардынацыйнай Рады трэцяга склікання Марыя Яфімава
- Belsat TV - Сяргей Падсасонны
- Блогер і спартыўны журналіст - Аляксандр Івулін
- Вольная грамадзкая ініцыятыва - Вераніка Станкевіч
- Беларускі цэнтр расследаваньняў - Бектур Іскендэр

Гэтая сустрэча была арганізавана крыху інакш, чым папярэднія, дзе мы маглі пачуць індывідуальныя даклады і правесці некалькі дыскусій пасля. На гэты раз арганізатары ўтварылі панэлі з некалькімі спікерамі, якія ўдзельнічалі ў абмеркаванні прадстаўленых пытанняў.

*Панэльная дыскусія 1. «Супрацоўніцтва дыяспар Паўночнай Амерыкі»*

- Як беларускія бізнесы сябе прэзентуюць у замежжы, як ідзе ўзаемадзеянне і камунікацыі паміж бізнесамі
- Якія медыя пляцоўкі існуюць ў ЗША і Канадзе? Што можа дыяспара і медыі зрабіць для бізнесу ў замежжы? Як рэкламаваць беларускія бізнесы сярод беларусаў?

- Якім чынам бізнесы могуць падтрымліваць дыяспаральныя структуры?
- Ці патрэбна нам агульная медыяпляцоўка для ЗША і Канады на прафесійным узроўні?
- Фінансавая будучыня дыяспары




*Панэльная дыскусія 2. «Узаемадзеянне беларускага бізнесу, СМІ і дыяспар»*

- Што на вашу думку павінна быць галоўнымі задачамі беларускай дыяспары ў бліжэйшыя 3 гады?
- Як дыяспары могуць дапамагаць Беларусі і Ўкраіне?
- Назавіце праблемы і поспехі беларускіх праектаў у замежжы за апошнія 3 гады? Культурныя праекты, туры артыстаў, дапамога пацярпелым, грамадскія ініцыятывы.



ISSN 2562-950

<u>*Панэльная дыскусія 3. «Беларускі бізнес за мяжой, сучасны стан і перспектывы развіцьця»*</u>




Трэцяя панэль была арганізавана партнёрам Асацыяцыяй беларускага бізнэсу за мяжой «ABBA», дзе сябры асацыяцыі распавялі пра ўласны досвед вядзення бізнесу за мяжой, але ўсё яшчэ адчуваюць сваю сувязь з Беларуссю.

Важна адзначыць, што арганізатары наўмысна пайшлі на ўкраінскі кейтэрынг для ўсёй ежы, якая прадастаўлялася падчас мерапрыемства, бо яны ведалі, што такім чынам увесь прыбытак ад гэтага пойдзе на падтрымку намаганняў Украіны ў барацьбе з ваеннай агрэсіяй Расіі.

І, вядома, мерапрыемства не магло быць завершаным бяз канцэрта. Перад гэтым удзельнікі пачулі прывітальныя словы ад Барбары Стаднік-Фелінчак, генеральнага сакратара, кіраўніка выканаўчага савета Кангрэса палякаў Канады.

Падчас канцэрта ўдзельнікі ўбачылі:

- Раісу Аршанскую і Віктара Котава, дуэт, які аб'яднаў фартэпіяна і нашы ўнікальныя цымбалы, якія сапраўды з'яўляюцца адным з сымбаляў Беларусі.
- Валянціну Шаўчэнка, шматгадовага лідара беларусаў Канады і моцную спявачку з прыгожым голасам.
- Юрась Шамецька, Беларускага і Канадыйскага паэта, які падзяліўся сваімі чароўнымі творамі.
- Міхала Рыкава, спявака, гітарыста і перакладчыка

- Яваровых Людзей, фальклёрны калектыў пад кіраўніцтвам Віялеты Кавалёвай
- Трыа Казакоў, прафесійную групу беларускіх выканаўцаў з ЗША.








***Дзень другі. 1 верасьня 2024 года***

Другі дзень саміту праходзіў у памяшканьні прыходу Сьвятога Кірылы Тураўскага і беларускім цэнтру. Адно з унікальных беларускіх месцаў у Паўночнай Амерыцы.

Удзельнікі паглядзелі выставу гістарычных артэфактаў і пачулі прэзентацыю пра гісторыю Беларускага цэнтра ў Таронта, прэзентацыі арганізацыяў канадскай

 ISSN 2562-950

дыяспары: ЗБК, Парафія Сьвятога Кірылы Тураўскага, БІНіМ Канады і вельмі цікавае прэдстаўленьне аб Радзе БНР. Пазьней таксама пачулі прэзентацыі: БАЗА, БІНіМ ЗША, Фундацыі Крачэўскага, Выдавецтва Скарына-Прэс і беларусаў у Брытаніі, іншых праектаў у Канадзе, ЗША, Польшчы.




*Дзень трэці. 2 верасня 2024 года*

Трэці дзень саміту праходзіў на тэрыторыі святыні пакутнікаў у Мідлендзе, Антарыё, дзе знаходзіцца яшчэ адзін унікальны беларускі артэфакт — Крыж Эфарысініі. Беларускі крыж у Мідлэндзе — помнік мучанікам за свабоду Беларусі, усталяваны ў манастырскім комплексе «Martyr's Shrine», які знаходзіцца ў 2 гадзінах язды ад Таронта, на возеры Гурон. Госці змаглі пабачыць не толькі адзіны ў Канадзе беларускі мемарыял, але і вялікі археалагічны музей з экспазіцыяй жыцця першых еўрапейскіх пасяленцаў у Канадзе.



№34, лістапад 2024 ISSN 2562-950

## На заканчэньне

Гэтая сустрэча паказала, што беларускія ідэі і мары яшчэ жывыя і працягваюць расці, нягледзячы на ўсе перашкоды. Гэтыя 3 дні зарадзілі ўдзельнікаў энергіяй, далі ідэі для новых праектаў і сталі пляцоўкай для супрацоўніцтва на карысць вольнай і незалежнай Беларусі.




Запрашэньні, справаздачу і ўражанні ад саміту можна паглядзець на Youtube-канале ЗБК:
https://youtube.com/playlist?list=PLpVAb1_mBacDQVchgTZAFpAueDQpjCJjv&si=AVWL15CG98LRM7dA

## Дадаткі да артыкула А.Каралькевіча

### Прывітаньне Старшыні Рады БНР, сп І.Сурвілла

*Дарагія Суродзічы, шаноўныя госці!*

*Ад імя Рады Беларускай Народнай Рэспублікі, маю прыемнасць вітаць Вас на гэтай 35-ай Сустрэчы Беларусау Паўночнай Амэрыкі.*

*25 сакавіка 1918 году Рада абвясьціла незалежнасьць Беларускай Народнай Рэспублікі. Бог ведае, дзе мы сёньня былі б бяз Акту 25-га Сакавіка.*

*Ад 1919 году, Рада дзейнічае на чужыне: першыя два старшыні, Крэчэўскі і Захарка - з Чэхаславаччыны, Абрамчык з Францыі, Жук-Грышкевіч з Канады, Сажыч з ЗША, і я - з Канады. Мэтай Рады да 1991-га году было - усімі даступнымі нам спосабамі - аднавіць незалежнасьць Беларусі, а з 1991-га - яе захаваць.*

*Дарагія Сябры,*

*Пачну маё прывітаньне сёньня словамі Якуба Коласа, “МОЙ РОДНЫ КУТ, ЯК ТЫ МНЕ МІЛЫ. ЗАБЫЦЬ ЦЯБЕ НЕ МАЮ СІЛЫ”. На маю думку, гэтыя словы яднаюць усіх нас лепш як любы іншы сымбал прыналежнасці да нашая зямлі. Усе мы тужым па бацькаўшчыньне, усе марым пра вольную, нармальную еўрапейскую краіну, якой Беларусь ужо магла б быць, калі б наш народ не паверыў у 1994-м годзе кандыдату ў прэзыденты, Лукашенку. Усе мы таксама робім што можам, каб памагчы нашаму народу выжыць і вызваліцца.*

*Сёньня хацела б звярнуць Вашую увагу на ролю беларусаў замежжа ў гэты час, калі паграгжае нашаму краю ня толькі страта незалежнасьці, але і генацыд нашага народу. Рэжым усімі спосабамі стараецца забраць ад нас і перадаць нашаму адвечнаму ворагу наш край. Пачаў ад знішчэньня нашая культурная спадчыны і няма таго дня каб ня прыдумаў якогась новага злачынства супраць беларушчыны.*

*Вельмі добра, што тыя з Вас, што прыехалі пасла 2020-га году ўжо ўзяліся за працу разам з першай пост-савецкай хваляй эміграцыі, якая пераняла асягненьні паваеннай хвалі, шматлікія ініцыятывы ажыцьцяўлаюцца ў праектах на карысць беларушчыны. З задаваленьнем бачу беларускія кніжныя клубы, віртуальныя спатканьні з паэтамі і пісьменьнікамі, святкаваньні нашых традыцыйных і нацыянальных святаў, на якіх прысутнічае штораз больш удзельнікаў. Нават кангрэс прэдпрымальнікаў - адсутнасць якіх была нашай традыцыянай слабасьцю.*

*Цяпер хацелася б падзяліцца з Вамі маімі прыярытэтамі.*

*<u>Першы з іх - наша ідентычнасць</u>! Пакуль Беларусь не станецца зноў такой, якой мы яе жадаем, мы не маем права асымілявацца!!! Наадварот - мы мусім усё рабіць каб зберагчы нашую беларускасць, і нашу душу - нашу мову!*

*Але каб захаваць нашую спадчыну - нам патрэбныя хоць адзін паважны музей і салідны Архіў. Наша дыяспара ня мае нават дзе захаваць сваю гісторыю!*

*Бо тады калі іншыя этнічныя групы стараліся заставіць па сабе след на гэтым кантынэнце, мы паўстагоддзя марылі аб вяртаньні на Бацькаўшчыну. Спадчыну нашую хацелі захаваць для Беларусі ў БЕЛАРУСІ, дзе яна вынішчалася.*

*Дык вось, мо возьмемся і пачнём тоя “fundraising”, каб нарэшце стварыць штось сталае тут, для будучых пакаленьняў беларусаў замежжа і беларусістаў.*

*<u>Другі мой прыярытэт</u>. ЕДНАСЦЬ. Мы народ разумны, інтэлігентны. Маем усе сваё меркаваньне, як зрабіць нешта правільна. Але нам адначасна вельмі цяжка*

*пагадзіцца з тым, што наш субяседнік таксама разумны, і мае СВАЁ меркаваньне. І магчыма таму часам спрачаемся, каб даказаць, што нашаяа праўда больш праўдзівая. У гэтым мы моцна падобныя да французау. Нам цяжка прызнаць, што думка субясedніка магчыма ня горшая за нашую, і што разам мы маглі б прыдумаць нешта яшчэ лепшае!*

*У гетыя цяжкія часы, калі так вазнаяе супрацоуніцтва каб штосьці асягнуць, канцепт "нацыяналнай згоды" (уніон натіонале) мог бы памагчы нам вырашыць шмат праблемаў. Дык мо варта папробаваць?*

*Хацела б нарэшце з Вамі падзяліцца доўгім дасведчаннем шматкультурнага жыцьця Канады. Усім нам ведама, што найбольшым заданьнем Беларусаў замежжа, гэта быць голасам беларускага народу, сапраўдным, гучным, які рэжым ад яго адабраў. Нашым заданьнем ёсць казаць свету, што мы існуем, і што ёсць на зямлі такі народ, які змагаецца за сваё месца між іншымі народамі Еўропы. Месца якое у яго адбіраюць два дыктатары - адзін здраднік, а другі агрэсар.*

*Нашым арганізацыям у Амерыцы і ўсюды ў свеце трэба ўваходзіць у большыя міжэтнічныя структуры - палітычныя, культурніцкія, мастацкія, літэратурныя, фальклорныя, - бо калі мы прысутныя, нас бачаць і пра нас ведаюць. Мы гэта называлі "політік де пресенце", - палітыка прысутнасці - якая нам памагла здабыць сваё належнае месца ў грамадзкім жыцьці Паўночная Амерыкі. Дзесяткамі гадоў мы стараліся быць прысутнымі на ўсіх міжетнічных емпрезах, ва ўсіх міжетнічных арганізацыях, і з намі лічыліся!*

*Прыйшла калеяка маладзейшай эміграцыі заняць гэтае месца і пакладаю вялікія надзеі што Вы гэта зробіце. Ведаю, што усе Вы робіце усё што можаце каб памагчы Украіне, і нашым палітычным вязьням. Але роля нашая на гэтым не канчаецца. Будзе яна галоўным заданьнем дыяспары пакуль не здабудзем пачэснае месца для нашага краю ў сям'і цывілізаваных народаў свету.*

*Але і гэта ня усё! Нам трэба реагаваць на кожнае няпраўдзівае слова, якое будзе напісана або сказана пра нас у заходніх СМІ, ці установах.*

*Нам трэба пісаць пратэсты, петыцыі, або папросту лісты - асабістыя або калектыуныя - каб прыпомніць што мы існуем. Разлічываю на Вашыя ініцыятывы, дарагія сябры! Кожны з Вас можа нечым падзяліцца, каб прыцягнуць увагу на Беларусь.*

*А галоўнае цяпер, каб не прагандлявалі Беларусьсю на карысць міру ва Украіне. Такая магчымасць існуе!!! Дык рабіце ўсё што у Вашых сілах, каб гэтага не дапусціць. У Амерыцы і ў Еўропе, РАЗАМ МЫ МОЖАМ!!!*

*Дык закончу на гэтым мой Зварот да Вас.*

*Вітаю Вас усіх і жадаю прыемна і карысна правесці гэтыя дні!*

*Жыве Беларусь!*

*Івонка Сурвілла, Старшыня Рады БНР*

**Прывітаньне ад З.Пазьняка**

***Выступ да 35-й Сустрэчы Беларусаў Паўночнай Амэрыкі***

*Паважаныя спадарыні і спадары, дарагія беларусы. Вітаю Вас на 35-й Сустрэчы Беларусаў Паўночнай Амэрыкі, якая цяпер адбываецца ў Канадзе. Зычу Вам узьнёслага настрою ў справе нашай дарагой Бацькаўшчыны-Беларусі.*

*Гэта вельмі добрая традыцыя, запачаткаваная ў 1952 годзе ў Канадзе, каб можна было рэгулярна, раз на два гады, беларусам сабрацца разам з усяго кантыненту і пагаварыць пра цяпершчыну, будучыню і нашае беларускае існаваньне.*

*Цяперака наша Айчына перажывае цяжкі час: краіна пад гібрыднай акупацыяй Масквы і прамаскоўскай здрады, там топчацца чужое войска і лятаюць чужыя самалёты, няспынна адбываюцца рэпрэсіі супраць беларусаў, у турмах 50 тысячаў вязьняў па палітычных абвінавачваньнях, зьнішчаюць беларускія кнігі і бібліятэкі, жыцьцё перапоўнілася расейскай хлусьнёй.*

*Але крок за крокам мы перамагаем гэты цяжкі час, бо ёсьць сілы і ёсьць людзі, якія тое робяць. Яны бачаць будучыню Айчыны. Тут я адзначу толькі адно важнае і патрэбнае для беларусаў правіла.*

*Гісторыя сьведчыць, што ў барацьбе за вольную Беларусь, за яе будучыню, за яе народ і свабоду мы, беларусы, можам спадзявацца толькі на самых сябе. Будзьма пэўныя ў сваёй сіле і ў сваіх магчымасьцях.  Будзе так, як мы зробім. Перад намі задача нацыянальнага існаваньня. Ведаючы гэта, шануйма сваю гісторыю, сваю беларускую мову і сваіх герояў.  Не пускайма чужых куміраў у нашае сэрца.*

*Цяпер наша добрая дзяржаўная будучыня будзе залежыць ад таго, ці створым мы беларускую вызвольную вайсковую сілу ў саюзе з Украінай. А мы яе створым. Усёй моцаю мы павінны дапамагаць украінцам у барацьбе супраць расейскага агрэсара.*

*Вітаю ўсіх беларусаў на гэтай сустрэчы. Хай шчасьціць усім быць разам!*

*Жыве Беларусь!*

*31 жнівень 2024 года.*

*Зянон ПАЗЬНЯК*

**Alex Korolkevich: 35th SUMMIT OF BELARUSIANS IN NORTH AMERICA** ***(webzine "Kultura.Natsyja", issue 34, November 2024, 215-228, www.sakavik.net )***

*Abstract.* The Belarusian Canadian Alliance (BCA) and the Belarusian-American Association (BAZA) held the 35th Summit of Belarusians in North America on 2024 Labour Day weekend in Toronto. This summit is one of the biggest Belarusian events abroad, organized by diaspora for diaspora. The tradition of these meetings has been going continuously since 1952. In this article readers can find a compact description of a 3 day long gathering of Belarusians in Toronto that proved that Belarusian Ideas and Dreams are still alive and continue growing despite all of the obstacles. The event charged participants with energy, gave them ideas for new projects and provided a platform for cooperation for the benefit of a free and independent Belarus.

**Александр Королькевич: 35-й САММИТ БЕЛОРУСОВ В СЕВЕРНОЙ АМЕРИКЕ** ***(вэб-журнал «Культура. Нация», № 34, ноябрь 2024, 215-228, www.sakavik.net)***

*Аннотация*. Беларуско-канадский альянс (BCA) и Беларуско-американская ассоциация (BAZA) провели 35-й Саммит беларусов Северной Америки в выходные, посвященные Дню труда 2024 года в Торонто. Этот саммит является одним из крупнейших беларуских мероприятий за рубежом, организованных диаспорой для диаспоры. Традиция таких встреч продолжается непрерывно с 1952 года. В этой статье читатели могут найти краткое описание трехдневной встречи в Торонто, которая доказала, что беларуские идеи и мечты все еще живы и продолжают развиваться, несмотря на все препятствия. Мероприятие зарядило участников энергией, дало им идеи для новых проектов и предоставило площадку для сотрудничества на благо свободной и независимой Беларуси.